***Маўленчая размінка.*** Прачытайце ўрывак з верша Петруся Мака́ля «Родная мова». Правільна вымаўляйце гукі [ў], [ц’], [г], [с’]; спалучэнні літар ***тч*** і ***дч*** перадавайце як [чч].

Як самую звонкую **ў свеце** навуку,
Як ройных вякоў пчаліную склад**ч**ыну,
Прымаю па складу, па смаку, па **гу**ку
Мову маю ма**тч**ыну!

**Бе́зліч** — незлічонае мноства, вялікая колькасць.
**Еўфра́т** — рака ў Турцыі, Сірыі, Іраку.
**Шлях з вара́гаў у грэ́кі** — вялікі (больш за 3 тыс. км) водны шлях Старажытнай Русі, які звязваў Варажскае (Балтыйскае) мора з Рускім (Чорным) морам.
**Дыяме́нт** — алмаз, брыльянт.
**Згу́ба** — смерць, гібель, знішчэнне.
**Адшчапе́нец** — чалавек, які адышоў ад свайго калектыву, парваў сувязь са сваім асяроддзем.
**Здра́дзіць** — перайсці на бок ворага; парушыць вернасць.



## У кнігарні

*Кастусь Цвірка*

Мы прыйшлі ў кнігарню з мамай.
На паліцах — безліч кніг!
Тоўстых, тонкіх — розных самых,
Цэлы свет — у кніжках тых!

— Я куплю табе во гэту...
Гэту й гэту варта ўзяць...




Ты пра ўсе краіны свету
З гэтых кніжак будзеш знаць.

Пра Аўстралію, Аляску,
Чылі, Індыю, Кітай.
Пра Еўфрат во нават казка...
Толькі, сын, бяры чытай.

— О, як добра! Дзякуй, мама!
Я пра іх чытаць люблю.
Толькі б знаць хацеў таксама
Я й пра нашую зямлю.

Пра яе лясы і рэкі,
Пра забытыя гады́,
Пра той шлях з варагу грэкі
І пра казкі-гарады.



Правообладатель Академия образования



І яшчэ — за што, няйначай,
Буду ўдзячны я ўдвайне —
Ты купі на мове нашай,
Беларускай, кніжку мне.

То ж Айчыны нашай мова,
Мова прадзедаў, бацькоў.
У той мове што ні слова —
Дыяме́нт жывы вякоў.

Ці паляк, ці грэк, ці швед там —
Мова ў кожнага свая.
Як усе, хацеў бы ведаць
Мову родную і я.

За яе, за край наш любы
У бітвах гінулі дзяды.
І яе ў баях ад згу́бы
Адстаялі назаўжды.

Невук — хто яе не цэніць.
Ці ж магу я здраджваць ёй:
Я ж не нейкі адшчапенец,
Я ж не нейкі чужаземец
На святой зямлі сваёй.

?

1. Хто з'яўляецца апавядальнікам у вершы: паэт ці герой яго твора? Дакажыце.
2. Куды наведаліся сын і маці? Чым кнігарня адрозніваецца ад бібліятэкі?

3. Кнігі якой тэматыкі маці прапанавала купіць сыну?
4. Прачытайце адказ, які даў сын маці. Што можна сказаць пра сына на аснове яго адказу? Выберыце адпаведныя пункты адказу:
   а) вызначаецца начытанасцю;
   б) цікавіцца гісторыяй не толькі свайго народа, але і іншых краін;
   в) прыхільнік роднай беларускай мовы;
   г) па-сапраўднаму любіць сваю Радзіму.
5. Якая з тэм, узнятых паэтам у вершы, з'яўляецца галоўнай? Дакажыце:
   а) тэма чытання кніг;
   б) тэма сучаснасці і гістарычнага мінулага беларускага народа;
   в) тэма захавання і развіцця беларускай мовы;
   г) тэма Радзімы.
6. У чым заключаецца асноўная думка верша Кастуся Цвіркі?
7. Разгледзьце ілюстрацыі на с. 105 і 106 да твора. Ці адпавядаюць яны яго зместу?
8. Падрыхтуйце выразнае чытанне верша па ролях. Паспрабуйце падабраць адпаведную інтанацыю падчас чытання слоў маці і сына.

**Творчае заданне. 1.** Па магчымасці праінсцэніруйце верш «У кнігарні». **2.** Паспрабуйце скласці свой верш (4-6 радкоў) пра прыгажосць беларускай мовы або прысвяціце яго нейкаму цікаваму слову або выразу.



Правообладатель Академия образования